Красавік 2019 г.

# «ЧЫТАЧАМ БРЫЛЁЎСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ ”

# Уладзімір АРЛОЎ



Маім дарагім чытачам з Брылёўскай бібліятэкі зычу ганарыцца славутымі перамогамі нашых продкаў. Ул. Арлоў 21.3.2019

# Грунвальд 1410.

## Погляд праз вякі — вачыма гісторыка, мастака, пісьменніка.

Раніцою 15 ліпеня 1410 года на пагорках каля вёскі Грунвальд /у перакладзе — Зялёны Гай/ сустрэліся

сеч...

С...

...ачках замест якой-небудзь ...віцкай бязглуздзіцы будзе ...а «Грунвальдская» або





Ул. Арлоў
21.3.2019

Дзяржаўныя мужы Беларусі

# РАГВАЛОД

Летапіс называе Полацк сярод гарадоў, дзе сядзелі князі, якія прызнавалі старэйшым між

бацьк…
довая…
князё…

не здолеў ні ўратавацца сам, ні выратаваць сям'і. «І паланілі Рагвалода,— піша летапі-



Майм дарагім чытачам з Брыгэўскай бібліятэкі, каб ніколі не забывалі, адкуль наш беларускі род.

[signature] 21.3.2019

## Дзяржаўныя мужы Беларусі

# ІЗЯСЛАЎ

Князь быў паганінам, а гэтая рэлігія дазваляла мнагажонства. Апрача полацкай князёўны, ён меў яшчэ сем ці шэсць жонак і трымаў восемсот наложніц. За неспатольную пажадлівасць Уладзімір заслужыў імя другога Саламона «в женолюбии»: біблейны герой, як вядома, выславіўся і розумам, і нястомнасцю ў плоцкіх уцехах.

Рагнеда нарадзіла ад Уладзі-

***Драма на берагах Палаты адбылася блізу 980 года, а праз колькі месяцаў Уладзімір Св***
***кн***
***блі***
***на***
***Пр***

слаўле … нні
юць м … , у

канаўскі летапіс,— тих и кроток, и смирен, и милостив, и любя зело и почитая священнический чин иноческий, и прилежаще прочитанию божественных писаний, и отвращаясь от суетных глумлений, и слезен, и умилен, и долготерпив». Ёсць у гэтым партрэце відавочная ідэалізацыя, але ёсць і звесткі, вартыя даверу.

Ізяслаў — першы з усходне-



# Валянціна АКСАК



нах з'яўлялася
я, нейкая не-

— так назвалі
тую сумесную
я Тамары Іва-
шаю і пакуль
кспазіцыі шмат
іх, рэдкіх, не-
іваныя ж абра-
ачкі сталі сап-
й.
ныя творы на-
эспубліканскія
эцыялісты не
глядам яе не-
ту. Не выяў-



ся. Пакуль што мастачка нават думкі не дапускае пра тое, каб расстацца са сваімі творамі. І яны месцяцца ў цеснай аднапакаёўцы Шаўцовых, якія не перастаюць спадзявацца, што іхняе багацце і на радзіме патрэбнае. Не на дзяржаву спадзяюцца, а, хутчэй, на тых, хто ў прыдачу да вялікіх грошай мае яшчэ і добры густ, і тонкае адчуванне хараства, і рупнасць пра творчы набытак айчыны...

**Валянціна АКСАК.**
**Фота Віктара Жыліна.**

21.05.2019

# Ціхая малітва з голкаю ў руках










ва, і рупнасць пра творчы набытак айчыны...

**Валянціна АКСАК.**
**Фота Віктара Жыліна.**

21.05.2019

# Алена БРАВА



Анатоль ВЯРЦІНСКІ



# Зорка Венера

Анатоль Вярцінскі

Чытачам Бронеўскай бібліятэкі — мае найлепшыя пажаданні
21.03.19 Анатоль Вярцінскі

* * *

*Твая воля — як воля лёсу.*
*Ты сустрэла мяне вясной,*
*Павяла мяне за сабой,*
*Павяла, узвяла да нябёсаў.*
*Была лёгкасць такая ў кроках,*
*Мае рухі такімі былі,*
*Што не знаў я: іду па аблоках*
*Ці імкліва лячу па зямлі.*
*Мне шчаслівая зорка мігала,*
*Хітравата падмігвала мне...*
*А затым ты мяне зняргала,*
*Ты звяла на зямлю па вясне.*
*Пазбаўляла крылаў шырокіх:*
*«Хопіць, мілы, лунаць ў аблоках.*
*Пахадзі па зямных шляхах,*
*Пахадзі на ўласных нагах».*
*І пайшоў я з надзеяй і страхам*
*Тым зямным,*
*тым цярністым шляхам.*
*Мне нялёгка ісці было,*
*Я ў адчаі хмурыў чало.*
*Сустракаліся лужыны, смецце,*
*Былі ўхабіны і карчы.*
*Мне хацелася уцячы,*
*Мне хацелася часам смерці.*






**Анатоль**
**ВЯРЦІНСКІ**

**Паездка на радзіму**
**з самадзейным студэнцкім**
**тэатрам «Жывое слова»**

*А. А. Калядзе*

Выбраў харошую гадзіну —
вясна дыхнула з усіх бакоў, —
і еду да сябе на радзіму,
да лепяльчан, да землякоў.
На душы ў мяне вяснова.
І яшчэ ад таго мне святлей,
што побач — гурт маладых людзей,
цэлы тэатр «Жывое слова».
Усё супала як пельга лепей —
прадвесне, дарога на родны Лепель
і тое, што весела так шуміць...
Нямарна завёмся «Словам жывым».
Ні болей ні меней: жывое слова.
Слова інакшым не можа быць.
Іначай што яно можа зрабіць?
Іначай не зерне яно, а палова.
А слова павінна быць,
як насенне,
якое сеем у дзень вясенні,
слова павінна прарастаць,
даваць усходы,
рунець,
красаваць.
Жывое слова — увасабленне
любові жывой, жывога сумлення.




Самотнай гасцёўцы
Брагінскай бібліятэкі —
найлепшыя пажаданні!
А. Вярцінскі
21.03.19--

Анатоль Вярцінскі

## ЛЕНІНСКІ СМЕХ

Ішла рэвалюцыя —
левай, левай!
Змагаліся не на жыццё,
на смерць.
Змагаўся Ленін.
І ўсміхаўся Ленін,
Служыў рэвалюцыі
ленінскі смех.
Была рэвалюцыя.
Яе змяніла
Пара разрух,
завірух,
галадух.
Розныя «контра» гразілі магілай,
Ды не здаваўся
ленінскі дух.
Ленін заставаўся Леніным —
І грозным караючым мячом,
І рэвалюцыі добрым геніем,
Яе душой,
яе Ільічом.
Ленінскі геній ведаў даўно:
Рэвалюцыя робіць дабро,
а не зло.
Дабро рэвалюцыю параджае,
Рэвалюцыя дабро сцвярджае.
Дабру не да твару змрочныя шоры.
Яму падавай марш мажорны,
Сонечны май ды светлую мару —
Усмешка дабру больш да твару.
Усмешкаю той і быў надзелены
Ільіч — носьбіт народнай надзеі,
Тым гумарком,
што з народных глыбінь.

# Леанід ДАЙНЕКА








## Леанід ДАЙНЕКА

Чытачам Брылёўскай бібліятэкі ад усёй душы! [illegible] 21/03/19 г.

* * *

Не чуеце роднага грому?
Не кліча сцежка дадому
У светлыя ветлыя ранкі?
Пішыце на эсперанта.
Не помніце бор вячысты?
Мілей, чым блакіт наш чысты,
Нябёсаў заморскіх транты?
Пішыце на эсперанта.
І спадчынаю вам будзе
Не дождж, што прыроду будзіць
І зерне сее глыбока,
А толькі цень ад аблокаў.

### Лявоніяда

Позна нас перавыхоўваць,
Позна горла перакоўваць.
Мы спяваем так, як можам,
Песняй белы свет трывожым.

Я застануся Лявонам,
У сваю зямлю ўлюбёным,
Хоць хваліце вы, хоць лайце,
Хоць на гуслі мне шпурляйце
Золата з усіх шкатулак —
Толькі там душы прытулак,
Дзе чакаюць, і працуюць,
І «Лявоніху» танцуюць.



# Зорка Венера

Леанід Дайнека

Дарагім чытачам брылёўскай бібліятэкі ад усёй душы! Дайнека 21/3/199[illegible]

* * *

*Шум зімовай пургі.*
*Холад рэк ледзяны.*
*І бялеюць снягі,*
*Як дзіцячыя сны.*

*Ці каханне жыве*
*І цвіце, як цвіло.*
*Як сказаць мне табе*
*Пра каханне сваё?*

*Як знайсці той маяк,*
*Той агонь залаты,*
*Калі ты — гэта я,*
*Калі я — гэта ты?*

Васіль

Ж








## Васіль
## ЖУКОВІЧ

Шаноўным чытачам
Брэсцкай бібліятэкі
зычу радаснага жыцця!
Васіль
Жуковіч

* * *

Няхай мяне няшчырасць абміне...
З маленства я знаёміўся з Купалам,
ды не адразу ў вочы мне запала
святло: «Я не для вас, паны, о не!»

Я не дзівуюся, што і пазней,
калі яго завучваў я з запалам,
у сэрца мне чамусьці не запала
струна: «Я не для вас, паны, о не!»

Мінулае не ў моры, не на дне...
Пажыў, пабачыў свету я нямала,—
і ў сэрца мне ударыў мой Купала
агнём: «Я не для вас, паны, о не!»

Паэзія — не ў вузенькім акне,
свет харашэе шчырасцю Купалы,
няпешчаная песня не прапала —
жыве: «Я не для вас, паны, о не!»

### Зялёны Луг Мінска

Мясціна дзіўнае красы,
глыбока я ў цябе ўлюбёны.
Глядзяць жылыя карпусы
у свет, да нітачкі зялёны.
І я гляджу. Хай дзень і ноч

# Васіль ЗУЁНАК





# Зорка Венера

## Васіль Зуёнак

Чытачам
Брылёўскай бібліятэкі, —
сонца і вясны!
Васіль Зуёнак
21.III.2019

* * *

*Ноч весняю мембранаю трымціць,*
*Пад небам —*
*толькі ты і толькі я...*
*Ды ў лазняку надрэчным,*
*у трысці,*
*Трывожна б'ецца песня салаўя...*
*Чаму,*
*чаму так лічыцца ў людзей,*
*Нібыта шчасцю ён — найпершы брат,*
*А песня ж салаўіная —*
*з надзей,*
*І шчасця ў салаўя —*
*зусім не шмат...*
*Сакрэт пазнаў я!*
*І аберагу —*
*Як ён —*
*тваё каханне і красу.*
*Цяпер я ўсё,*
*усё як ёсць*
*магу —*
*Я песню салаўіную нясу.*




Васіль Зуёнак
21.III.2019.

Васіль Зуёнак

## «АПАСІЯНАТА»

### Успамін за мяжой

Ноччу шэра і зябка
Пад вокнамі ходзіць імжа.
Сны, падкурчыўшы лапкі,
На халоднай падушцы ляжаць.

Перамеран пакоік:
Кожны крок — да Радзімы вярста...
...Мама грае...
                Такое —
Не стрымаюць армады застаў.

Мама грае...
                Як птушкі,
Дні маленства ляцяць з небыцця.
Мама грае...
                Істужкай
Заружовеў на ўсходзе прасцяг.

Мама грае...
                Ахове
Хай соладка сняцца чыны.
Мама грае...
                Бетховен
Да сонца
            выводзіць чаўны.

Расступаецца морак.
«Хутка стрэнемся, родныя, зноў...»
Хутка зведае вораг
Гэту сілу —
                ночы без сноў!

Не арлом двухгаловым
Узнята на крылах зара!








Чытачам Брылёўскай бібліятэкі — на добрае сяброўства з родным беларускім словам, —

**Васіль ЗУЁНАК**

Васіль Зуёнак
21.III.2019.

## Па-беларуску

Дагэтуль носім той ганебны комплекс,
Гняце непаўнацэннасці сіндром:
Маскоўскі градус і разліў маскоўскі —
Ад космасу да нарыхтоўкі дроў...

Не з Белай вежы, а з Крамлёўскай вежы
Глядзець на свет прывучаныя мы.
Трымаемся адно маскоўскіх сцежак,
А ад сваіх бяжым, як ад чумы.

Блукаем па гісторыі няўцямна:
Ліцвіны, зрэшты, мы ці маскалі?
І плачам: ці не іншапланецяне
Падладзілі нам смехам Віскулі?..

Нібы з Масквою, з вёскаю пушчанскай
Аднойчы сам Нью-Йорк загаварыў,
І нам на галаву, як на няшчасце,
Упалі незалежнасці дары...

Што з ёй рабіць нам на дарозе коўзкай,
Дзе мусіш сам апірышча шукаць?






# Васіль Зуёнак

Чытачам [illegible] бібліятэкі, — поспехаў!
Васіль Зуёнак
21.III.2019.



## ЎСЕ

*Хоць турбуюцца самазванцы:*
*Кнот за кнотам — дымяць,*
*фасонячы,—*
*Патрабуюцца пратуберанцы,*
*Што з грудзей выбухаюць сонечных.*

*Толькі той, хто згарае светачам,*
*Сам сабою — без партуліку,*
*Адгукнецца на сцежках вечнасці*
*Беларусі, святой і вялікай.*

## «Ё»-МАЁ

*Анатолю Кудраўцу,*
*галоўнаму рэдактару «Нёмана»,—*
*з нагоды 50-годдзя часопіса*

*Гаварылі так, як пісалі,*
*Прамаўлялі прыціснута: «Неман»,—*
*І глыбінна-пляскотныя хвалі*
*Разбіваліся плоска і нема.*

*У штабах ахоўна-галоўных*
*Так на картах «отобразили»...*

*Ой ты, Нёман, чаму ж ты не поўны*
*Без тых кропелек дзвюх — слязінак?..*

*«Е» ці «ё»?.. Беларускі характар...*
*Пахадзіў па замежжы ў заробкі...*
*«Ё-маё!» — прамовіў рэдактар,—*
*і над «е» паставілі кропкі.*

*І ўздыхнуў на ўсе грудзі «Нёман»,*
*Пакруглеў басавіта ў гучанні...*
*Ну а мы — маўчым пакрыёма:*
*«Ё» — не гэткі ўжо крок адчайны.*

*Бо ўжо «Нёман» цячэ ля дому*
*І каму ён «рече» — невядома:*
*Хто жыве ў нас, а мовы не знае,*
*Ці хто роднай сваёй пагарджае?..*

*І калі ўжо здамашніўся «Нёман»,*
*Не бяжыць за мяжу ўпрытруску —*
*Ё-маё!..— дык а раптам ён дома*
*Загаворыць па-беларуску?!.*

✦

*Жывём ды «ўсё наадварот»,*
*Мяняем карту генную,*
*І хутка круглы ідыёт*
*Пачне лічыцца геніем...*

# Віктар КАЗЬКО






МИНСК
ИЗДАТЕЛЬСТВО «МАСТАЦКАЯ ЛIТАРАТУРА»
1974

Чытачам ... бібліятэкі, ...

21.III.2018

В.Казько




Бібліятэка
школьніка

# Віктар Казько

# Суд у Слабадзе

Аповесць

1040
Могилевская ЦБС
Могилевской обл.

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2007

# Андрэй ФЕДАРЭНКА






Чытачам
Брылёўскай бібліятэкі
ад аўтара!

21.03.2019г.

*Андрэй Федарэнка*

## Срэбны свечнік

Ціхай восенню 189... года ў фальварку аднаго з паўднёвых паветаў Беларусі паміраў ад невылечнай хваробы трыццацідвухгадовы шляхціц Ладымер Козыр.

Ужо не было ніякіх спадзяванняў, нават лекі на століку не стаялі. Дактары, якіх ён ненавідзеў і якім забараніў тут з'яўляцца, знайшлі ў яго рак мозга. Ён не верыў ніводнаму іхняму слову. Сцішаны, безуладны і лёгкі, ён ляжаў у вузкім пакойчыку з акном на лес. Праз шчыльную гардзіну сачылася роўнае матавае святло, а што там было за акном — празрысты грыбны туман, падсвечаны вячэрнім сонейкам, з лятаючымі павуцінамі, з трымценнем на ветрыку бронзавых асін і жоўтых бяроз, ці не туман гэта быў зусім, а салодкі дым гарэлых куч картаплішча, і, увогуле, сонца ніякага не было, а проста адкідваліся на гардзіну водбліскі ад гэтых вогнішчаў-картаплішчаў,— ён не ведаў.

Смерць у пакутах здавалася яму цяпер за літасць Божую. У яго не балела нічога. Учора ён кідаўся з ложка, хапаў нож, відэлец, каб спаласаваць, закалоць сябе, кусаў сябе за рукі. А сёння ён не мог нават руку адарваць ад коўдры. Учора ён хоць жыў нянавісцю да ўрачоў, увогуле да людзей, да маладой здаровай жонкі, а сёння і нянавісць знікла. Яму заставаўся толькі ліпкі жах. Божа, і гэта пасля ўсяго, што ён выцерпеў! Ужо ж ён прасіў у Цябе не жыцця, не папраўкі, а толькі лягчэйшага адыходу ў смерць! Каб падрыхтавацца, каб правесці гэты апошні свой дзень у бяспамяцтве, каб адпачыць ад усяго недзе паміж жыццём і смерцю... Але, калі Козыр заплюшчваў вочы, была толькі смерць; калі глядзеў, заходзячыся ад жаху,— было вакол толькі жыццё. І восеньскі позні камар лятаў, звінеў, і гардзіна ўнізе варушылася ад ветру, і жоўтая падлога, і белая столь, і срэбны свечнік, што забылі прыбраць з ягоных вачэй.

Козыр слабеў, пачаліся цёмныя правалы.

— Божа, ці чорт, ці хто... памажыце!..— прашаптаў ён дзікім голасам у пусты куток.

Але й гэта было пачута. Адразу ж рыпнулі дзверы і паказалася жонка. Козыр жаласна застагнаў. Яна падбегла.








Чытачам
Брылёўскай
бібліятэкі
ад [illegible]!
21.03.2019 г.

Андрэй
ФЕДАРЭНКА

# ЛАНЦУГ

Аповесць

*Ахвяруецца Аліне Анатольеўне МАРКОЎСКАЙ*

Мал. У. Скрыганава.

## I

Было лета, каля дзесяці гадзін раніцы, а ў кабінеце хірурга 14-й Мінскай клінічнай бальніцы Стэльмаха гарэла святло — на дварэ з самай ночы сеяўся цёмны, халодны дождж... Кабінет знаходзіўся на першым паверсе старога, з тоўстымі сценамі і маленькімі, нізкімі вокнамі будынка, таму добра было чутно, як вада патокам бяжыць па асфальтавай дарожцы і сцякае ў люк пад акном. Па шыбах паўзлі звілістыя кроплі, у адчыненую фортку з двара залятала халодная імжа, і, здавалася, нават старыя клёны ў бальнічным дворыку, на якія глядзела адзінае акно кабінета, неяк пагорбіліся, апусцілі пад гэтай няспыннай макрэчай

# Кастусь ЦВІРКА






* * *

На той зямлі, дзе ў зорны час
Пакінуты маленства вёслы,
Каторы год без нас, без нас
Па колкіх броўках
ходзяць вёсны.

У вольных вольхах зноў і зноў
Цвітуць ясноткі і таўкачыкі.
За табунамі тумаeasy
У асацэ нясуцца качкі.

Мы —
ці даруюць нам палі? —
Зрасліся з горадам, як з ценем,
І часта — парасткі зямлі —
Не тое робім, што хацелі б.

Ды помніць сэрца плыт і плуг,
Высокі жнівень, свет пясчаны...
Сячы ж аб дом —
па шклу, па тлу —
Вясновы лівень ачышчальны!

*1962*




**БАЛАДА ПРА ХАТЫНЬ**

*Кастусь Цвірка*

Была на Зямлі (у Лагойскім раёне,
на Беларусі)
вёска хат сасновых — Хатынь.
Там гуляла ў вокнах сінь,
на сонцы грэліся гладышы і слоікі,
сушыў іх на сонцы тын.
Там поле вясной аралі,
жытам і лёнам зямлю засявалі,
Там песні свае (такіх нідзе не пачуеш!)
на Купалле і на дажынках спявалі.



Брылёўскай бібліятэцы
21.03.19

**БАЛЛАДА О ХАТЫНИ**

*Кастусь Цвирка*

Была на Земле (в Логойском районе,
на Беларуси)
деревня хатенок сосновых — Хатынь.
Там гуляла в оконцах синь,
грелись на солнце гладыши и горлачики,
сушил их на солнце тын.
Там поле весной пахали,
житом и льном его засевали,
Там песни (таких не услышишь нигде)
на Купалу и на дожинки певали.






## *Такія сэрцы ў нас*

Такія, мусіць, косці ў нас —
Нам у пуху не спіцца,
Такія, мусіць, ногі ў нас —
Нідзе нам не сядзіцца,
Такія, мусіць, рукі ў нас —
Ніяк ім не стаміцца.

Ім трэба муляцца, касцям,
У цягніку на дошках,
Ім трэба пыльны стэп, нагам,
Змяраць ушыр і ўдоўжкі,
Ім трэба лёд прабіць, рукам,
Скалу здрабіць на крошкі.

Хай проста ў вочы дождж і гром —
Не змусіш нас згінацца,
Хай раптам цела зморыць сном —
Не будзем мы хістацца,
Хай заінее нават лом —
Мы не расшчэпім пальцаў,

Такія, мусіць, рукі ў нас,
Такія, мусіць, ногі ў нас,
Такія, мусіць, косці ў нас,—
Такія сэрцы ў нас!

1959

Чытачам Брагінскай бібліятэкі —
К. Цвірка
21.03.19[illegible]

*І дні,*
*І гады праплылі.*
*І вось я*
*Вярнуўся дадому.*
*Ізноў мы з табою пайшлі*
*На ўзгорак,*
*Да соснаў знаёмых.*
*Цяпло*
*Тваіх рук адчуваў,*
*Зарой*
*Твае вусны гарэлі.*
*Я ціха,*
*Пяшчотна сказаў:*
*— Суніцы,*
*Суніцы паспелі!..*

Бракоўскай бібліятэцы
Цвірка
21.03.2009 г

## Кастусь Цвірка

### Я ПРЫЙШОЎ ДА ВАС...

*Я прыйшоў да вас, каб сказаць,*
*Што за горадам ноч, як дзень:*
*Каля рэчак вербы не спяць,*
*Ясны месяц стаіць у вадзе.*

*Там, ля сцежі*
*Май шугае пр*
*Там дзве пары*
*У някошаныя*

*Я прыйшоў д*
*Што не раз м*
*Хоць любой н*
*Паўтарыцца*

*Хай прымоўк*
*Хай замерла*
*Цёплым крыл*
*Расцвітаюць*

*Я прыйшоў д*
*Што няма на*
*Будзе вечна*
*Залатое кола*

7 Зак. 1147



# Брылёўская сельская бібліятэка Магілёўскага раёна Беларусь

- Красавік 2019 г.